# Арлен Міхайлавіч Кашкурэвіч

## З нагоды 80-годдзя мастака



Пачатак мастацкага шляху народнага мастака Беларусі Арлена Міхайлавіча Кашкурэвіча прыпадае на канец 50-х гадоў XX стагоддзя. Час надзвычайна складаны для самастойнага мастацкага мыслення і свабоднага развіцця індывідуальнасці. Кашкурэвіч належыць да тых мастакоў, якія здолелі сцвердзіць свае права глядзець на гісторыю і свет па-свойму, ісці сваім шляхам у мастацтве.

Дамінантай усёй творчасці Арлена Міхайлавіча Кашкурэвіча з'яўляецца праблема маральнага выбару чалавека. Мастак шмат працуе над ілюстраваннем твораў І. В. Гётэ, В. Быкава, А. Адамовіча, Ч. Айтматава. У сваіх работах ён становіцца паўнавартасным сутворцам пісьменніка, а нярэдка і спрачаецца з аўтарам, філасофствуе разам з ім. Пытанне аб месцы чалавека ў сучасным свеце з'яўляецца адным з галоўных, якія паўстаюць перад мастаком і яго гледачамі.

Творы Арлена Міхайлавіча Кашкурэвіча адзначаны прэміямі і дыпломамі на разнастайных выстаўках па ўсім свеце. Многія з іх знаходзяцца ў мастацкіх музеях Беларусі, Расіі, Германіі, Польшчы, ЗША, а таксама ў шматлікіх прыватных калекцыях. За сваю творчую працу мастак быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь і ўдастоены ганаровага звання «Народны мастак Рэспублікі Беларусь». Жадаем Арлену Міхайлавічу Кашкурэвічу і надалей здароўя, бадзёрасці і вялікіх творчых поспехаў у яго нялёгкай, але так неабходнай усім працы.

*Георгій Лойка,*
*галоўны рэдактар часопіса*
*«Мастацкая адукацыя і культура»*





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ